5. Современные образовательные технологии / В.Г. Селевко. – Москва, 1998. – 256 с.

**Abstract.** The features of the design and organization of modular learning technology are discussed in the article. Blocks-modules can be of three types: cognitive, operational and mixed. Evaluation of the success of students ' training in the rating system is carried out by the current, intermediate and final control.

УДК 37.01:94

**Мяньчэня С.В.,** старшы выкладчык
*УА «Беларускі дзяржаўны аграрны тэхнічны ўніверсітэт»,*
*г. Мінск, Рэспубліка Беларусь*

# ПРАБЛЕМЫ І ПЕРСПЕКТЫВЫ ВЫКЛАДАННЯ ГІСТАРЫЧНЫХ ДЫСЦЫПЛІН У ВЫШЭЙШЫХ НАВУЧАЛЬНЫХ УСТАНОВАХ ТЭХНІЧНАГА ПРОФІЛЮ

***Анатацыя.*** *Ва ўмовах рэфармавання вышэйшай школы паўстае пытанне аб месцы гістарычных дысцыплін у падрыхтоўцы спецыялістаў markazнага профілю, у тым ліку тэхнічнага. Для адаптацыі дадзеных дысцыплін для патрэб часу і грамадства прапануецца ажыццявіць пераход да праблемных гістарычных курсаў, праводзіць працу па стымуляванню самастойнай працы студэнтаў і папулярызацыі гістарычных ведаў.*

Грамадзянскія пачуцці і жыццёвая пазіцыя будучага спецыяліста на прамую залежыць ад паспяховага засваення матэрыяла дысцыплін сацыяльна-гуманітарнага блока і фарміравання адпаведных кампетэнцый. Гуманітарныя дысцыпліны, асабліва гістарычныя, акрамя фарміравання навыкаў аналіза, крытычнага разумення, маўлення, выконваюць выхаваўчую і ідэалагічную функцыю. У сувязі з гэтым на выкладчыкаў лажыцца адказнасць за падрыхтоўку не толькі спецыяліста, але і патрыёта-грамадзяніна, ад якога будзе залежыць эканамічная і палітычная бяспека дзяржавы, і адмаўляць значэнне

Рэпазіторый БГАТУ

гістарычных дысцыплін для падрыхтоўкі спецыялістаў тэхнічнага, аграрнага профіля нельга.

На дадзены момант дысцыпліны гістарычнага цылка ў Беларускім дзяржаўным аграрным тэхнічным універсітэце прадстаўлены абавязковым модулем "Гісторыя" (дысцыпліна "Гісторыя Беларусі ў кантэксце еўрапейскай цывілізацыі") – 34 аўдыторныя гадзіны, выніковая форма кантроля – дыферыянцаваны залік; спецыяльзаванымі модулямі па выбару "Гісторыка-культурная і духоўная спадчына беларускага народа" – 34 а.г., залік (першапачаткова дысцыпліна была звязана з модулем "Філасофія") і "Станаўленне і развіццё беларускай дзяржаўнасці" – 34 а.г., залік; факультатывам "Вялікая Айчынная вайна савецкага народа (у кантэксце Другой сусветнай вайны)" – 10 а.г., форма кантроля некаторы час увогуле адсутнічала, зараз праяўляецца ў выстаўленні ў заліковую кніжку запісу "праслухана".

Паспяховасць засваення дысцыпліны ў значнай ступені залежыць ад матывацыі студэнта. Цікаўнасць студэнтаў да гістарычных дысцыплін абумоўліваецца рознымі фактарамі, на шэраг з якіх – негатыўны вопыт у школе, выніковая форма кантролю (больш важным для студэнта будзе прадмет, па якім ён здае экзамен) і нават расклад заняткаў (вопыт сведчыць аб праблемах з наведваннем першых і апошніх пар вучэбнага тыдня) – выкладчыкі паўплываць фактычна не здольны. Калі разглядаць тыя аспекты, якія знаходзяцца ў кампетэнцыі выкладчыкаў, то тут, на нашую думку, трэба прытрымлівацца наступных правіл:

Недапушчэнне фармалізацыі выкладання дысцыпліны і дубліравання матэрыяла. У выпадку, калі студэнт слухае тое ж, што ён вывучаў у школе, яго цікавасць да дысцыпліны, калі яна была, і засваення інфармацыі знікае. З іншага боку важна захаванне пераемнасці школьнай і ўніверсітэцкай праграмы, бо выкладанне дысцыпліны на больш высокім узроўні немагчыма без базавых ведаў. Тэарэтычна, выхад з дадзенай сітуацыі прысутнічае ў модульна-рэйтынгавай сістэме, дзе прадугледжаны ўваходны кантроль ведаў, які дазваляе дыферынцыяваць студэнтаў па ўзроўню падрыхтоўцы, але пры адсутнасці мабільнасці па-за вучэбнай групай дыферынцыяваны падыход магчымы толькі пры падрыхтоўцы індывідульных заданняў.

Рэпазіторый БГАТУ

Пошук новых форм выкладання не павінны весці да вульгарызацыі гісторыі, ці празмернага захаплення гульнёвымі формамі і праглядам відэаматэрыялаў, што ў цэлым дыскрэдытуе сістэму вышэйшай адукацыі, важнасць дысцыпліны і руйнуе аўтарытэт выкладчыка.

Важнай праблемай з’яўляецца і насычанасць праграмы і неадпаведнасць вучэбнага матэрыяла курса “Гісторыя Беларусі ў кантэксце еўрапейскай цывілізацыі” колькасці аўдыторных гадзін. Так восемь стагоддзяў нашай гісторыі - перыяды першых дзяржаў-княстваў, Вялікага княства Літоўскага і Рэчы Паспалітай – разам з палітычным, сацыяльным, культурным і эканамічным развіццём – павінны ўкласціся ў 6 аўдыторных гадзін. У гэтых умовах значна ўзрастае роля самастойнай працы студэнтаў, а перад выкладчыкам стаіць дылема – ці чытаць праблемную лекцыю, якая будзе эфектыўнай пры дастатковай базе ведаў студэнтаў, ці звярнуць увагу на асобныя моманты, спадзяваючыся на самастойную падрыхтоўку студэнта, ці рабіць максімальную “выжымку” з курса – даць той мінімум, які неабходны для атрымання прахадной адзнакі.

Далейшая паспяховасць выкладання гістарычных дысцыплін можна звязаць з наступнымі мерапрыемствамі:

1. Пераразмеркаванне вучэбнага матэрыяла абавязковага модуля “Гісторыя” на карысць спецыялізаваных курсаў – гісторыя дзяржаўнасці, культуры, аграрных адносін, ці эканамічнага развіцця ў цэлым, што ў рэаліях суадносін наяўных аўдыторных гадзін і аб’ёма вучэбнай праграмы выглядае цалкам лагічным рашэннем. Тэматычныя курсы дазваляюць выкладаць матэрыял на больш высокім узроўні, месцамі адыйсці ад храналагічнага прынцыпа выкладання, без якога цяжка ўявіць суцэльную гісторыю, да праблемнага. Прыкладам такога падыхода можа лічыцца курс “Гісторыка-культурная і духоўная спадчына беларускага народа”, які быў уведзены ў вучэбны працэс у 2014/15 годзе. У межах дысцыпліны рзглядаюцца ў тым ліку пытанні этнічнай гісторыі, развіцця культуры і грамадска-палітычнай думкі Беларусі. Пытанням палітычнага развіцця развіцця Беларусі і развіцця гістарычных форм нашай дзяржаўнасці прысвечана дысцыпліна “Станаўленне беларускай дзяржаўнасці”, якая была распрацавана ў 2014 г., але ў навучальны працэс не ўведзена. Мэтазгодным з’яўляецца распрацоўка курса “Гісторыя аграрных адносін”, што будзе адпавядаць профілю ўніверсітэта, дазволіць

Репозиторий БГАТУ

выявіць этапы равіцця, гістарычны вопыт і перадумовы складвання сучаснай спецыялізацыі сельскай гаспадаркі Беларусі.

2. Стымуляванне самастойнай працы студэнтаў у форме індывідуальных і калектыўных праэктаў. Ва ўмовах модульна-рэйтынгавай сістэмы выніковая адзнака залежыць ад выканання рознаўзроўневых заданняў. Студэнт можа сам абраць стратэгію дзеяння і тую планку, на якую ён прэтэндуе. Атрыманне вышэйшых адзнак звязана з дзейнасцю, якая, па сутнасці, выходзіць па-за межы праграмы. У якасці магчымай формы працы тут можна прапанаваць заданні па лакальнай гісторыі, пры выкананні якіх студэнты будуць збіраць інфармацыю, аб гістарычных падзеях пэўнага мікрарэгіёна, аказваць дапамогу ў пошуку і інтэрв'іраванні сведкаў часу, стварэнні каталога гістарычных аб'ектаў. Безумоўна, што тут ініцыятыва павінна зыходзіць з боку выкладчыка, але важна і дакументальнае замацаванне такой дзейнасці з боку ўніверсітэта (як варыянт – стварэнне студэнцкай навуковай суполкі пры кафедры, удзел у якой кампенсуе час грамадскай практыкі).

3. Папулярызацыя гістарычных ведаў шляхам арганізацыі экскурсій, сустрэч, кінасеансаў з абавязковым крытычным разглядам і абмеркаваннем, удзелу ў археалагічных экспедыцыях.

На сёняшні дзень застаецца невырашаным лёс анансаванага ў 2018 годзе курса “Гісторыя беларускай дзяржаўнасці” (аўтары-складальнікі І.А. Марзалюк, П.І. Брыгадзін, С.М. Ходзін і інш.), які згодна з тыпавой праграмай разлічаны на 54 аўдыторныя гадзіны, з якіх 36 – гэта лекцыйныя заняткі, а па зместу з'яўляецца кампіляцыяй “Гісторыі Беларусі ў кантэксце еўрапейскай цывілізацыі”, “Паліталогіі” і “Асноў ідэалогіі беларускай дзяржаўнасці”, абавязковы характар вывучэння двух апошніх праэктам новай рэдакцыі Канцэпцыі аптымізацыі зместа, структуры і аб'ёма сацыяльна-гуманітарных дысцыплін ва ўстановах вышэйшай адукацыі не прадугледжваецца [1]. Пры ўсёй важнасці дадзенай тэматыкі, на наш погляд, курс, у сваім чарнавым варыянце, мае разам з плюсамі і шэраг недахопаў. Сярод першых можна вылучыць баланс паміжвучэбным матэрыялам і колькасцю аўдыторных гадзін, чаго не назіраецца ў курсе “Гісторыя Беларусі ў кантэксце еўрапейскай цывілізацыі”. Раздзелы “Асновы дзяржаўнага будаўніцтва Рэспублікі Беларусь” і “Беларусь на стыке культур і цывілізацый” прадугледжаваюць правядзенне праблемных лекцый, значная ўвага надаецца сучаснаму стану



Репозиторий БГАТУ

беларускай дзяржаўнасці, месцы і ролі Рэспублікі Беларусь у сусветнай палітычнай сістэме. Разам з гэтым у курсе адсутнічае тая тэарэтычная база, якая закладваецца модулем "Паліталогія" – варыятыўнасць дзяржаўных ідэалогій, палітычных сістэм і рэжымаў, выбарчых сістэм, тлумачэнне механізму ажыццяўленне дзяржаўнай улады. Але аўтары тыпавой праграмы даюць магчымасць адаптаваць яе, змяніўшы да 30% зместа [1].

Такім чынам, гістарычныя дысцыпліны, у адпаведнасці з тымі задачамі якія яны вырашаюць, застаюцца важнай складаючай падрыхтоўкі спецыялістаў вышэйшай адукацыі рознага профілю. Пошук новых форм і адаптацыя гістарычнай адукацыі да патрэбаў часу і грамадства звязаны з пераходам да праблемных гістарычных курсаў, стымуляванні самастойнай працы студэнтаў і папулярызацыі гістарычных ведаў.

Спіс выкарыстанай літаратуры

1. Проект концепции оптимизации содержания, структуры и объёма социально-гуманитарных дисциплин в учреждениях высшего образования. – [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступа: https://edustandart.by/proekty/proekty-normativnykh-pravovykh-dokumentov/item/2087-kontseptsiya-optimizatsii-soderzhaniya-struktury-i-ob-ema-sotsialno-gumanitarnykh-distsiplin-v-uchrezhdeniyakh-vysshego-obrazovaniya.

**Abstract.** In the context of reform of higher education the question of the place of historical disciplines in the training of specialists in various fields, including technical, is raised. To adapt historical subjects to the needs of the time and society we should address the problem history courses, stimulate the students' independent work and popularization of historical knowledge.

Репозиторий БГАТУ